**Мікалаеў, М.** Хто загоіць сардэчныя раны? / М. Мікалаеў // Герой працы (Шуміліна). — 2001. — 13 лют. — С. 1.

## ХТО ЗАГОІЦЬ САРДЭЧНЫЯ РАНЫ?

У Сяргея Іваноўскага ўчэпістая памяць на даты. Помніць ён і дзень прызыву ў рады Савецкай Арміі – 14 кастрычніка 1986, і калі прымаў вайсковую прысягу, і дзень прыезду ў Афганістан. Можа таму так ўсё добра помніцца, што малады быў, што хацеў служыць салдатам. Прызнаўся: нават калі быў у вучэбным цэнтры ў Ленінакане (Арменія), дзе вучыўся ваяваць ва ўмовах гор, і ведаў, што будзе страляць баявымі патронамі, што «духі» – не сябры, а заклятыя ворагі, – ведаў пра ўсё гэта і не баяўся, не стаў шукаць прычыны, каб адслужыць у Саюзе.

Сяргей служыў вадзіцелем. Да арміі заканчваў аўташколу пры ДТСААФ, таму калі ішоў у войска, ведаў, што давядзецца круціць баранку машыны. 7 лютага 1987 года юнак разам з іншымі воінамі прыбыў у горад Найбабад. Яшчэ там, да таго, як трапіць у сваю часць, дзе і праваяваў 18 месяцаў, убачыў душманаў. «Трубачы» (так называлі паміж сабой салдат, што ахоўвалі трубаправод) злавілі трое маджахедаў у чалмах – дваіх сталага веку і аднаго юнака гадоў пад шаснаццаць. Дарослыя барадатыя, злыя, як ведзьмакі, яны з нянавісцю глядзелі на рускіх прышэльцаў, але боязі ці нейкага пачуцця страху ў Сяргея не было: ён яшчэ мацней сціскаў у руках аўтамат.

Сяргай Іваноўскі служыў-ваяваў па ахове трасы, праводзіў калоны савецкіх аўтамашын. У яго падпарадкаванні была рамонтная тэхніка, і кожны раз побач ішлі два БТРы. Хапіла на яго долю і абстрэлаў, і бамбёжак – усяго, без чаго вайны, вядома, не бывае. Папрацавалі і «асабісты», каб не мог трапіць вадзіцель у рукі душманаў, у яго за сядзеннем была пакладзена граната, а да чакі мацаваўся дроцік, які было лёгка, адным рухам рукі крануць і – смерць. Ведаў Сяргей (зноў-такі папрацавалі паліторганы), што ў палон да душманаў трапляць нягодна, і вельмі страшна: катуюць так, што мала не здасца. Дзякуй Богу, што нашаму земляку не давялося рваць гэты дроцік з чакой. Усякага было, а такой сітуацыі, каб без выйсця – ніколі.

Асабліва «радавалі» ворагі гулам бамбёжак ды абстрэламі пад савецкія і свае святы – на Новы год, 7 лістапада, на рамазан. Але пра тое, як адчувалася ў час гэтых святочных кананад, Сяргей згадваць не хоча – навошта лішні раз вярэдзіць сэрца, атручваць памяць самым непрыемным. Ахвотней расказваў ён пра земляка з вёскі Сураўні – старшыну Мікалая Аганіна, які ваяваў там жа, але ў пяхотных часцях. Пазнаёміліся выпадкова. Мікалай на паўгода раней з'язджаў з Афганістана і заехаў да бацькоў Сяргея, прывёз ад яго вестачку.

Калі з'язджаў сам Сяргей, на сэрцы было лёгка і радасна. Прызнацца, надакучыла гуляць са смерцю. І даслужваў свой салдацкі тэрмін Іваноўскі ў Туве, у Сібіры. Не ведаў тады ён, што яшчэ глыбей, на Далёкі Усход, прывядзе яго доля шукальніка прыгод і заробкаў. Але гэта будзе пазней, у 93-м, праз пяць гадоў пасля «дэмбеля». Захацелася яму кантрактнай службы ў войску, і пасля школы прапаршчыкаў ён трапляе на Далёкі Усход, прызначаецца начальнікам радыёстанцыі.

Работа радыста – асобны радок у ягонай біяграфіі. Асабліва дапамагло Сяргею Іваноўскаму ў асваенні радыёсправы захапленне ігрой на гітары. Недзе з пятага ці шостага класа ён сам навучыўся ў хлопцаў браць акорды, а калі трохі пасталеў, набраўся спрыту і майстэрства,

пайшоў у ВІА «Ваяж». Існавала такая група пры райсельгастэхніцы. Дык вось гэтая гітара была нязменным сябрам у яго вандроўках. Праўда, калі вяртаўся з Далёкага Усходу (можа, служыў бы і далей, але расфарміравалі іхнюю часць), на вакзале ў Маскве выкралі ў яго рэчы і гітару. Прыснуў з далёкай дарогі, не чакаў, што так могуць абысціся з вайскоўцам.

Нядаўна вярнуўся з вайсковай службы малодшы брат Сяргея – Васіль. Служыў у Беларусі кінолагам, ахвотна расказваў пра службу. А Сяргей не хоча згадваць сваю афганскую эпапею, не ляжыць нешта душа да тых ўспамінаў. І таму не хоча, што ў той час было ганарова насіць імя воіна-інтэрнацыяналіста, а цяпер быццам ужо і вораг, і захопнік. Так вось павярнулася кола гісторыі. Аднак жа хто загоіць сардэчныя раны ў тых юнакоў, якія прайшлі праз ваеннае пекла, праз гарніла горнай вайны ў Афганістане?

**М. Мікалаеў**